УДК 821.161.3

# МАСТАЦКАЯ РОЛЯ ДЫЯЛЕКТЫЗМАЎ У «ПАЛЕСКАЙ ХРОНІЦЫ» І. МЕЛЕЖА

***М. Р. Шляхтун***
*курсант 1 курса факультэта міліцыі*
*Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь)*
*Навуковы кіраўнік:* ***М. М. Караткоў,***
*старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС (Беларусь),*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

І. Мележ неяк зазначыў, што «Палескую хроніку» пачаў пісаць чыста літаратурнай мовай. Але неўзабаве адчуў, што гэта не дазваляе адлюстраваць жыццё палескай вёскі 20–30 гадоў такім, якім ён яго памятаў і разумеў. Не такімі, як ён іх уяўляў, атрымліваліся вобразы герояў будучага твора. Чыста літаратурная мова ў пэўнай ступені абмяжоўвала магчымасці паказу рэчаіснасці ў формах самога жыцця. Гэтая акалічнасць, відаць, і абумовіла ўключэнне ў мастацкую тканіну твора мясцовай моўнай плыні, дыялектызмаў. У выніку вобразы герояў і персанажаў твора набылі значна больш акрэсленыя адзнакі жыхароў пэўнай мясцовасці, прадстаўнікоў пэўнай эпохі, сацыяльных груп, нарэшце, індывідуальнасцей. У выніку ў раманах «Палескай хронікі» выразна стала адчувацца атмасфера таго часу.

Варта адзначыць, што суадносіны чыста літаратурнай мовы і дыялектызмаў у «Палескай хроніцы» з цягам часу ў пэўнай ступені змяняліся. Так, у першых рэдакцыях раманаў «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» аўтар актыўна выкарыстоўваў дыялектызмы не толькі пры перадачы мовы персанажаў, але і ў аўтарскім апавяданні. Гэта давала дадатковыя магчымасці для выяўлення сэнсавых і эмацыянальных адценняў сказанага. Аднак у некаторых выпадках гэта было не зусім апраўдана. Асобныя словы тыпу «паглядны» (прыгожы) [1, с. 299], «пал» (гарачнасць, парыў) [1, с. 45], крывота (крывадушнасць) [1, с. 316], «зяўлясты» (гарласты) [1, с. 313], «выпінкі» (выпукліны) маглі быць незразумелымі чытачу. Тое ж можна сказаць і аб некаторых дыялектызмах, якія сустракаюцца ў мове персанажаў: «чавіць» (душыць), «ашмётак» (шматок) [1, с. 369], «бебахі» (памёт) і да т. п.

Відаць, таму пісьменнік у апошніх рэдакцыях раманаў «Палескай хронікі» больш строга паставіцца да адбору лексічных сродкаў з пункту погляду іх зразумеласці для чытачоў. Ён па сутнасці амаль зусім адмовіўся ад

выкарыстання дыялектызмаў у аўтарскім апавяданні. І пазбавіўся ад адзначаных вышэй недахопаў пры перадачы мовы персанажаў.

Такім чынам, дыялектызмы ў «Палескай хроніцы» І. Мележа адыгрываюць значную мастацкую ролю ў стварэнні вобразаў персанажаў у іх тыповасці і індывідуальных асаблівасцях, у стварэнні мясцовага каларыту ў творы.

1. Мележ І. Завеі, снежань // Мележ, І. Зб. тв. : у 10 т. Т. 7. Мінск : Маст. літ., 1982. 558 с. Вернуться к статье